УДК 37.013.8:39(476)

# Беларуская народная педагогіка ў кантэксце гендарнай культуры

**С.Д. Мацюшкова, С.Р. Туболец**
*Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава»*

*Нашу эпоху вызначае мноства разнастайных культурных феноменаў, у тым ліку змяненне ўяўленняў аб сабе і ролі мужчын і жанчын у грамадстве, якое аспрэчваецца старэйшым пакаленнем і крытыкуецца новым. Таму востра стаіць пытанне павышэння ўзроўню гендарнай культуры моладзі, які здольны ўраўнаважыць сучасны і традыцыйны падыходы да жаноцкасці і мужнасці, а гэта, у сваю чаргу, знітавала б традыцыйныя і сённяшні погляды на азначанае пытанне.*

*Мэтай даследавання з'яўляецца пераасэнсаванне этнапедагагічных традыцый беларускага народа ў выхаванні дзяцей рознай палавой прыналежнасці ў кантэксце гендарных даследаванняў.*

***Матэрыял і метады.*** *У якасці матэрыялаў для даследавання вылучаны фальклорныя матэрыялы беларускага народа, абрады, звычаі, зборы прыказак і прымавак. Метады даследавання: тэарэтычны аналіз і сінтэз эмпірычных дадзеных, гендарны аналіз.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *У артыкуле аналізуюцца традыцыі беларускага народа ў выхаванні дзяцей рознага полу ў кантэксце гендарных даследаванняў, накіраваныя на падтрыманне бесперапыннасці жыцця, фарміраванне якасцяў, неабходных для арганізацыі жыццёвага шляху жанчыны і мужчыны. Актуальнасць матэрыялу абумоўлена неабходнасцю знаёмства моладзі з традыцыямі выхавання ў беларускіх сем'ях, якія склаліся ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя, таму што сям'я гэтага часу характарызавалася стабільнасцю, высокім выхаваўчым патэнцыялам і сілай. Вывучэнне фальклорных матэрыялаў беларускага народа, абрадаў, звычаяў, традыцый у кантэксце гендарных даследаванняў дазваляе зрабіць выснову, што сям'я, нягледзячы на ўсялякія трансфармацыі грамадства, выконвае першасную ролю з усіх сацыяльных інстытутаў у фарміраванні гендарнай культуры як састаўной часткі агульнай культуры, і таму сама павінна ёю валодаць на досыць высокім узроўні.*

***Заключэнне.*** *Этнапедагагічныя традыцыі беларускага народа накіраваны на выхаванне годных прадаўжальнікаў роду ў сацыяльна-культурным і ва ўтылітарна-практычным сэнсе. Роля бацькоў у фарміраванні гендарнай культуры дзяцей была і будзе вядучай і вызначальнай.*

***Ключавыя словы:*** *выхаванне, этнапедагагічныя традыцыі, гендарная культура, сям'я.*

# Belarusian Folk Education in the Context of Gender Culture

**S.D. Matyushkova, S.R. Tubolets**
*Educational establishment «Vitebsk State P.M. Masherov University»*

*Our era is noted by a wide variety of cultural phenomena, including changing perceptions of themselves and the roles of men and women in society, which is being contested by the older generation and criticized by the younger one. Therefore is an urgent need to improve the gender culture of youth, which is capable to balance modern and traditional approaches to femininity and masculinity, and this, in turn, is linked to the traditional and present views on the above issue.*

*The purpose of research is to rethink ethnical and pedagogical traditions of the Belarusian people in the upbringing of different gender in the context of gender studies.*

***Material and methods.*** *The materials for the study are folklore materials of the Belarusian people, rituals, customs, collections of proverbs and sayings. The methods are theoretical analysis and synthesis of empirical data, gender analysis.*

***Findings and discussion.*** *The article analyzes the traditions of the Belarusian people in the education of children of different sex in the context of gender studies, aiming at maintaining the continuity of life, the formation of the qualities necessary for the organization of the way of life of women and men. Relevance of the material is due to the necessity to acquaint young people with traditions of upbringing in Belarusian families, established in the late XIXth – early twentieth centuries, because the family of that time was characterized by stability, high educational potential and power. Studying folklore materials of Belarusian people, rituals, customs and traditions in the context of gender studies suggests that the family, in spite of all transformations of the society, performs the primary role in all social institutions in shaping gender culture as an integral part of the general culture and therefore itself it must possess a sufficiently high level.*

***Conclusion.*** *Ethnical and pedagogical traditions of the Belarusian people are focused on education of worthy successors of the family from the point of view of social and cultural as well as utilitarian and practical sense. The role of parents in shaping gender culture of children was and is leading and decisive.*

***Key words:*** *education, ethnical and pedagogical traditions, gender culture, family.*

Сусветнай суполкай прызнаная неабходнасць гуманізацыі выхавання, насычэння яго гуманістычнымі ідэямі. Аднак пошук накірункаў пераўтварэння і рэфармавання ідзе ў большай ступені ў замежных выхаваўчых сістэмах. Недаацэньваецца або проста ігнаруецца найбагацейшы вопыт, што заснаваны на айчынных народных гуманістычных традыцыях выхавання. У той жа час працэс выхавання павінен быць арыентаваным не на нейкую асярэдненую асобу, якая жыве ў грамадстве, пазбаўленым нацыянальнай ідэі, а на асобу, што жыве ў краіне з пэўнай нацыянальнай ідэнтычнасцю, са сваімі гуманнымі каштоўнасцямі, якімі спакон веку карысталася народная педагогіка. Менавіта народная культура выхавання ўяўляе сабой аснову ўсялякай культуры. Таму сёння існуе неабходнасць выявіць і рэалізаваць на практыцы гуманістычныя ідэі беларускай народнай педагогікі, якія знайшлі адлюстраванне ў матэрыялах народнай творчасці. Мы прытрымліваемся пазіцыі, што заўжды мае месца пераемнасць педагагічных выхаваўчых ідэй, нягледзячы на змену сацыяльных, палітычных, эканамічных умоў.

Сучасныя даследчыкі народнай педагогікі (якую разглядаем як адзінства педагагічнай думкі і выхаваўчага вопыту чалавечай суполкі), у прыватнасці Г.П. Арлова, В.С. Болбас, В.У. Буткевіч, Ю.С. Любімава, А.Л. Міхайлава, У.В. Пашкевіч, Л.В. Ракава, пераканаўча даказваюць, што выкарыстанне народна-педагагічнай спадчыны дапамагае выхаваць асобу, якая мае дачыненне да ўсяго свету, выгадавана на лепшых культурных дасягненнях чалавецтва, здольна да інтэграцыі ў сусветную культуру і цывілізацыю, бо не згубіла сваёй нацыянальнай самабытнасці [1].

Нашу эпоху вызначае мноства разнастайных культурных феноменаў, сярод якіх можна вылучыць наступную тэндэнцыю: мужчыны і жанчыны радыкальна мяняюць уяўленне адзін пра аднаго. Сёння, на думку айчынных і замежных даследчыкаў (І.С. Клецына, Л.Г. Цітарэнка, В.І. Часнакова, Л.В. Штылёва і інш.), паняцце пра жыццёвае прызначэнне прадстаўнікоў абодвух палоў размытае, традыцыйныя вобразы мужчыны-здабытчыка і жанчыны-захавальніцы хатняга агню крытыкуюцца з-за нераўназначнасці іх становішча, а новыя погляды канчаткова не сфарміраваліся. Прычым сучасныя трактоўкі мужчынскіх і жаночых роляў аспрэчваюцца старэйшым пакаленнем і крытыкуюцца новым. Таму востра стаіць пытанне павышэння ўзроўню гендарнай культуры моладзі, які здольны ураўнаважыць сучасны і традыцыйны падыходы да жаноцкасці і мужнасці, а гэта, у сваю чаргу, знітавала б традыцыйныя і сённяшні погляды на азначанае пытанне.

Гендарная культура як састаўная частка агульнай культуры з'яўляецца сукупнасцю сацыякультурных характарыстык, якія вызначаюць узаемаадносіны мужчын і жанчын на аснове гендарных каштоўнасцяў. Змест гендарнай культуры вызначаецца ўяўленнямі аб мужнасці/жаноцкасці, ролі мужчын і жанчын, гендарнымі каштоўнасцямі, стратэгіяй і формамі гендарных паводзін. Структурнымі кампанентамі гендарнай культуры з'яўляюцца: гендарныя веды (паняцці і ўяўленні, якія дапамагаюць раскрыць асаблівасці паводзін і адносін паміж прадстаўнікамі як свайго, так і процілеглага полу); гендарныя адносіны (узаемадзеянне, заснаванае на прынятых асобай гендарных нормах і правілах, якія выказваюць стаўленне да сябе і іншых прадстаўнікоў свайго і супрацьлеглага полу); гендарныя каштоўнасці (духоўныя сацыякультурныя рэгулятывы гендарных адносін, якія складваюцца ў працэсе засваення культуры і з'яўляюцца каштоўнымі для большасці членаў грамадства). У лік гендарных каштоўнасцей уваходзяць: агульначалавечыя (эгалітарнасць; разуменне культурна-гістарычнай ролі мужчын і жанчын у грамадстве; кангруэнтныя адносіны да значнасці прадстаўнікоў абодвух палоў для сучаснага грамадства, як на ўзроўні самога грамадства, так і асобы) і індывідуальна-асобасныя (аб'ектыўнае ўспрыманне мужчын і жанчын у грамадстве без акцэнтавання ўвагі на іх негатыўных рысах; непрыманне агрэсіі і гвалту ў адносінах паміж мужчынам і жанчынай; узаемапавага і самапавага, станоўчыя адносіны да сябе і членаў суполкі незалежна ад полу; роўныя правы і абавязкі членаў сям'і, іх партнёрскія ўзаемаадносіны).

У кантэксце беларускай народнай педагогікі сям'я выконвае першасную ролю з усіх сацыяльных інстытутаў у фарміраванні гендарнай культуры, і таму сама павінна ёю валодаць на досыць высокім узроўні. Вельмі актуальна для сучаснага грамадства знаёмства моладзі з традыцыямі выхавання дзяцей рознага полу ў беларускіх сем'ях, якія склаліся ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя, калі насельніцтва не знаходзілася пад уплывам масавага ўрбанізацыйнага працэсу з яго адмоўнымі бакамі. Пераважную колькасць насельніцтва складала сялянства, дзе панавала стабільная сям'я, моцная міжпакаленнымі і роднаснымі сувязямі, высокім выхаваўчым патэнцыялам. Увага да абранага перыяду абумоўлена пашыраным выкарыстаннем традыцый беларускай педагогікі ў жыцці грамадства, якія на той час з'яўляліся адзіным сродкам выха-

вання дзяцей беларусаў. Гэта час найбольш цэласнага погляду на пытанні культуры, гендарнай у прыватнасці. Этнапедагагічныя традыцыі выхавання дзяцей былі накіраваны на падтрыманне бесперапыннасці жыцця, на фарміраванне якасцяў, што неабходныя для арганізацыі жыццёвага шляху жанчыны і мужчыны, на паразуменне неабходнасці існавання і ўзаемадапаўняльнага пачатку ролей мужа і жонкі.

Пад традыцыямі, згодна з напрацоўкамі філосафаў Э.С. Маркарана, Ю.А. Лявады, А.В. Мудрыка, А.Б. Гофмана, мы будзем разумець працэс перадачы сацыяльнай спадчыны (матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці) і яе спосабы. Адзначаецца, што ў якасці традыцый выступаюць пэўныя грамадскія законы: нормы паводзін, каштоўнасці, ідэі, звычаі, абрады [2]. Традыцыя – гэта сістэма перадачы сацыяльна значных ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, навыкаў, што гістарычна склалася на працягу стагоддзяў пад уплывам нацыянальнай культуры і накіравана на захаванне і памнажэнне народнага вопыту.

Сёння, як ніколі раней, уяўляецца важным вывучэнне нацыянальнай, традыцыйнай культуры, асабліва ў плане выхавання дзяцей у супрацьвагу (або дадатак) моднай тэндэнцыі ўспрымання карціны свету праз усходнюю традыцыю (кітайскія, японскія гараскопы, летазлічэнне і астралагічныя прадказанні), праз мас-культуру. Мы разумеем, што сістэма традыцый этнасу з'яўляецца вынікам яго выхаваўчых намаганняў на працягу вякоў. Мы бачым у традыцыі сістэму перадачы сацыяльна значных ведаў, каштоўнасцей, поглядаў, навыкаў, што гістарычна склалася на працягу стагоддзяў пад уплывам нацыянальнай культуры і накіравана на захаванне і памнажэнне народнага вопыту. Навукоўцамі абгрунтавана даказана, што народныя традыцыі і звычаі заключаюць у сабе шмат такога, што можа быць з поспехам выкарыстана пры стварэнні новага. У рамках фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці, традыцыйнага погляду на ролю мужчыны і жанчыны неабходна вывучаць асаблівасці поглядаў беларусаў на выхаванне і развіццё дзяўчынак і хлопчыкаў як у агульным, так і паасобку.

Мэта даследавання: на падставе тэарэтыка-метадалагічнага аналізу пераасэнсаванне этнапедагагічных традыцый беларускага народа ў выхаванні дзяцей рознай палавой прыналежнасці ў кантэксце гендарных даследаванняў.

**Матэрыял і метады.** У якасці матэрыялаў для даследавання вылучаны:

– фальклорныя матэрыялы беларускага народа (прыказкі і прымаўкі як афарыстычны канцэнтрат народных поглядаў на жыццё, выхаваўчыя ідэі), абрады (традыцыйныя дзеі, што суправаджаюць найбольш значныя моманты чалавечага жыцця), звычаі (звыклыя ўзоры паводзін, што адбываюцца ў пэўны час), традыцыі (сацыяльная і культурная спадчына, што перадаецца між пакаленнямі);

– манаграфічныя працы айчынных (Г.П. Арлова, В.С. Болбас, А.Л. Міхайлава, Л.В. Ракава, Л.Р. Цітарэнка, В.І. Часнакова) і замежных (І.С. Клецына, Л.В. Штылёва) навукоўцаў;

– зборы прыказак і прымавак (Г. Дулеба, З. Санько, А. Фядосік), фальклорных матэрыялаў (А. Сержпутоўскі);

– працы, прысвечаныя аналізу традыцыйнай беларускай культуры філолага Я. Крука, педагога А. Катовіч.

У даследаванні выкарыстоўваліся:

– тэарэтычны аналіз і сінтэз эмпірычных дадзеных дзеля збору неабходнай інфармацыі, вылучэння састаўных частак і галоўнага, групавання матэрыялу згодна з мэтай;

– гендарны аналіз з мэтай збору якаснай інфармацыі і яе выкарыстання для выяўлення і разумення патэнцыйных праблем і пошуку рашэнняў. Метадалагічнай асновай гэтага аналізу сталі тэорыя інтэрпрэтацыі гендара як культурнай метафары (Л. Іррыгарэ, Х. Сісу, Ю. Крысцева), тэорыя гендарных адрозненняў у сацыяльных паводзінах (С. Кросс, Л. Мэдсан), ідэя аб гендары як сацыякультурным канструкце (Ш. Бёрн, В.А. Вароніна, І.С. Клецына, М. Мід, К. Хорн), канцэпцыя палавой сацыялізацыі (Д.М. Ісаеў, У.Я. Каган, І.С. Клецына, Я.Л. Каломінскі, І.С. Кон), тэорыя гендарнага падыходу да адукацыі (Л.В. Штылёва) і выхаванні (А.М. Каменская).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Намі было выяўлена, што многія з'явы сацыякультурнага жыцця на аснове асацыятыўнага раду лічыліся спрыяльнымі або неспрыяльнымі фактарамі жыцця дзіцяці. Напрыклад, калі пры з'яўленні немаўляці ў доме пражываў чалавек старога ўзросту, доўгажыхар, то гэта "прадракала" вельмі шчаслівае і даўгавечнае жыццё дзіцяці. Прыкметай шчасця быў і які-небудзь прыбытак у сям'і, напрыклад, здзейснілася загадзя прызначаная вялікая купля, хатняя жывёла прынесла прыплод і г.д. Акрамя таго, прыкмета шчаслівага дзіцяці – нараджэнне яго з доўгімі валасамі, захаванне плоднага пузыру («кашулі») на галаве або целе (…з таго дзіцяці будзе вельмі шчаслівы чалавек, да не толькі ён сам, але й уся сям'я будзе праз яго мець шчасце…" [цыт. па: 3, с. 172]. Нездарма да гэтага часу пра людзей, у якіх усё ў жыцці складваецца выключна спрыяльна, кажуць: "У кашулі нарадзіўся". Прызнаным рытуалам было

прымаць дзіця на пялёнкі са старога адзення бацькоў ці прабацькоў. "Робляць гэто дзеля таго, каб дзіця ва ўсім было, як яго бацькі, дзяды ці другія сроднікі" [цыт. па: 3, с. 174]. Цікава: калі дзяўчынка, падрастаючы, станавілася падобная на бацьку, а хлопчык – на маці, то гэта лічылася спрыяльным прадвесцем, знакам шчаслівага жыцця.

Важным момантам у народнай традыцыі з'яўлялася стаўленне да дзяцей, якія нарадзіліся, не маючы законнага бацькі (маці "прыдбала, прынесла ў падоле", "ветрам надзьмула" і г.д.). Такую жанчыну асуджалі за легкадумнасць, але дзіця разглядалася ў зусім іншым ключы. Частковая абяздоленасць у сацыяльным плане, грамадская непрыязнасць да жанчыны з-за адсутнасці асвечанага законам нарачонага кампенсаваліся верай у тое, што дзіця будзе прыносіць поспех і шчасце навакольным людзям. Да такіх дзетак з задавальненнем ішлі ў хросныя бацькі [4]. Такім чынам сельская абшчына спрабавала аднавіць парушаны выхаваўчы патэнцыял сям'і. Акрамя таго, існавала цікавае павер'е, што, калі дзяўчына "засядзелася ў дзеўках", то яна можа змяніць сваё становішча, калі пахрысціць няшлюбнага хлопчыка. Як толькі ён пачне хадзіць – дзяўчына выйдзе замуж [5–7].

Адметная рыса поглядаў продкаў на нараджэнне складаецца ў тым, што гэта не проста момант з'яўлення на свет чалавека, а з'ява сацыяльная, а таму – культурная і гістарычная. Народжаны член суполкі пражыве шэраг цыклаў чалавечага існавання (дзяцінства, маленства, сталасць, старасць). Трэба ўлічваць, што пераход праз іх заўжды надае чалавеку пэўны, прыняты грамадствам статус, з выкананнем зафіксаваных абавязкаў. Таму нараджэнне хлопчыка ці дзяўчынкі заўсёды суправаджалася выкананнем шэрагу адпаведных традыцыйных абрадаў, рытуалаў, спецыфічных дзеянняў, з уцягваннем у іх большасці членаў сямейна-родавай суполкі. У прыватнасці, роля бацькі ў рытуальным прыманні дзіцяці пачынаецца з вырабу новай калыскі. Лічыцца, што гэта павінны зрабіць менавіта сам бацька, хаця б нешта дарабіць у рэчы, бо, калі ён гэта не зробіць, "та дзіця не будзе бацька шанаваць" [цыт. па: 3, с. 181].

Народ верыў, што час сутак, калі нараджаецца дзіця, можа быць шчаслівым (ад апоўначы да апоўдня) або нешчаслівым (апоўначы, апоўдзень, час заходу сонца) фактарам лёсу. Існавала ўяўленне пра шчаслівыя і нешчаслівыя хвіліны, гадзіны. Таму жыццё чалавека шмат у чым залежала ад таго, у які момант ён з'яўляўся на свет [4–5]. Так, у сістэме светапоглядных уяўленняў беларусаў розных рэгіёнаў кожны дзень тыдня быў надзелены сваімі пэўнымі рысамі, якія пераходзілі да новага члена грамадства.

Народжаны ў панядзелак – чалавек настрою, хоць рашучы і ўпарты. Ён любіць пагаварыць, але яшчэ больш любіць слухаць, асабліва тое, як яго хваляць. Такія людзі ядуць шмат мясной ежы і любяць кветкі. Адзначаецца, што яны нічога не пазычаюць іншым, але забываюцца, калі пазычалі самі. Аднак тыя, хто нарадзіўся бліжэй да заходу сонейка, больш мяккія, душэўныя.

Чалавек-аўторак – аматар спрэчак. Яго нельга назваць надзвычай ахайным. Вельмі добра ўмее прыстасоўвацца, да старасці назапашвае капітал, але не хваліцца гэтым; замкнёны, аднак гэта не адштурхоўвае, а прываблівае да яго іншых людзей (бо бачаць у ім надзейнага чалавека). Абавязкова прыходзіць на дапамогу сваяку ў няшчасці.

Дзеці серады кволыя, таму патрабуюць асаблівага клопату бацькоў. Калі пяройдуць небяспечную ўзроставую мяжу, то будуць жыць доўга. Яны прыгожыя, славалюбівыя, валодаюць прыемным характарам, надзвычай верныя супругі. Сваё жыццё аддаюць сям'і, багатымі не бываюць, бо багацце «не прыжываецца» каля іх. Яркі выраз існуе ў народзе: "У сераду раніцай нарадзіўся". На жаль, лічыцца, што ў душы людзі серады нешчаслівыя і адзінокія.

Тыя, хто нарадзіўся ў чацвер, маюць прывабную знешнасць, трымаюцца прыгожа і з годнасцю. Гэта выдатныя сябры, выключна клапатлівыя бацькі. Яны вельмі цэняць утульнасць і спакой, выдатна гатуюць. Любяць ваду, ім падабаецца спяваць, прымаць гасцей.

Пятніца дорыць сваім дзецям пачуццё спагады да слабых і бездапаможных, творчыя здольнасці, добразычлівасць, гераічную схільнасць. Калі атрымліваюць добрую адукацыю, то гэтыя людзі здольныя дасягнуць вялікіх вышынь.

Тыя, хто прыйшоў у гэты свет у суботу, – меланхалічныя, не любяць прыслухоўвацца да парад, лічаць сябе вельмі разумнымі. Яны асабліва не прыхарошваюцца, надзяваюць адзенне старога ўзору. Калі пранікнуцца павагай да сваіх "карапёў", продкаў, то могуць атрымаць магчымасць вылечваць. Людзі суботы здольныя раптоўна разгневацца, але пасля імкнуцца хутчэй памірыцца.

Нядзельнае нараджэнне, па павер'і, дорыць моцнага анёла-ахоўніка, які дапамагае фарміраванню шчаслівага лёсу. Такіх людзей любяць, на іх спадзяюцца, яны становяцца доўгажыхарамі. Нават пры самай цяжкай хваробе яны здольныя ачуняць [5].

Разгляд гендарнага аспекту сямейнага выхавання можна пачаць з разгляду адносін у сям'і

беларусаў да нараджэння дзяцей рознага полу. Важным лічым і той факт, што наогул дзяцей у сям'і павінна быць шмат: "У каго дзеці, у таго і шчасце", "Багаты Аўдзей – поўна хата дзяцей", "Малыя дзеці – малы клопат, большыя дзеці – большы клопат", "Малыя дзеткі – малыя бедкі, большыя дзеткі – вялікія бедкі", "Без дзяцей ціха, ды на старасці ліха", "Бацька з маткай на рабоце не томяцца, калі з дзетак сваіх цешацца" [8–9]. Нягледзячы на тое, што віталася вялікая колькасць дзяцей, народам адзначаны шэраг цяжкасцей і праблем, якія спадарожнічалі такому сямейнаму статусу, як шматдзетнасць: "Дзяцей як бобу, а хлеба ні дробу", "Бяда без дзяцей, але ж бяда і з дзецьмі", "Маці сама не з'есць, а дзяцей накорміць", "Твае дзеці, табе і глядзеці", "У каго матка, у таго галоўка гладка", "Даў Бог дзеці, але няма іх дзе падзеці" [4; 8].

Традыцыйная культура асабліва адрознівае мужчынскі пачатак як дынамічны, поўны энергіі, актыўны (у процівагу жаночаму, які адпавядае стабільнасці і спакою). У беларускай сям'і, як і ў большасці народаў, аддавалі перавагу сынам. Гэта звязана з асаблівым становішчам жанчыны ў грамадстве, з разуменнем неабходнасці падрыхтоўкі пасагу для замужжа дачкі. Хлопчык разглядаўся як працаўнік, нашчадак, апора для бацькі (асабліва ў старасці) – "будзе каму вочы зачыніць". Дзяўчынка – памочніца ў доме, падтрымка маці: "Без дачкі сям'я, што без агня". Аднак неабходна адзначыць, што жаданне мець сына ці дачку залежала яшчэ і ад наяўнасці ў сям'і дзяцей аднаго полу. Калі нараджаліся сыны, то хацелі дачку, а калі дзяўчынкі, зразумела, марылі пра сына. Сапраўднымі бацькамі лічыліся тыя людзі, што выгадавалі шмат дзяцей: "Адзін сын – не сын, два сыны – паўсына, тры сыны – сын", "Дзе сыноў лава, там бацьку слава, дзе дачок лава, там матцы слава", "У каго дачок сем, то ёсць доля ўсім, а ў каго адна – то і тая долі жадна" [8–9].

Адназначна ўсе бацькі радаваліся нараджэнню здаровага дзіцяці, незалежна ад яго полу. Гэта звязана з тым, што фізічныя недахопы або калецтва для селяніна маглі быць непераадольнай перашкодай пры стварэнні ўласнай сям'і. Тым не менш, для заможных дзяўчат, нават якія маюць фізічны недахоп, жаніх знаходзіўся практычна заўсёды. Як сведчыць Л.В. Ракава, "часам дзяўчына з багатай сям'і, якая моцна кульгала або мела іншы фізічны недахоп, выходзіла замуж за самага прыгожага хлопца, бо, як абвяшчае народная мудрасць, "За няўдачу даюць бальшую прыдачу (пасаг)" [10].

Гендарная дыферэнцыяцыя як працэс, у якім біялагічныя адрозненні паміж мужчынам і жанчынай надзяляюцца сацыяльным значэннем, пачыналася ў беларускіх сем'ях з моманту нараджэння. У залежнасці ад полу дзіцяці абрад цырыманіяльнага адсячэння пупавіны праводзіўся з дапамогай інструментаў для жаночых або мужчынскіх работ, прадметаў, што сімвалізавалі дастатак, сілу [7, с. 31–32]. Так, хлопчыку пупавіну маглі перарэзаць на нажы, сякеры, малатку, на дубовай кары, сухой скарыначцы хлеба, кніжцы, а дзяўчынцы – на грэбні, верацяне, нітках, нажніцах [3; 5–6; 10]. Гэты звычай злучэння пупавіны з прадметам мужчынскага або жаночага свету сімвалізаваў палавую ідэнтыфікацыю, канчаткова "фіксаваў" пол дзіцяці.

Цікавы абрад "замацавання" полу немаўлят. Паколькі хлопчыка з'яўляўся будучым гаспадаром дома, то яго паслед закопвалі каля дома пад ганкам або на вуглу дома. Дзяўчынка ж ва ўяўленні беларусаў – будучая гаспадыня, жонка і маці, таму яе "дзіцячае месца" закопвалі пад яблыняй, вішняй (дзеля пладавітасці і прыгажосці) або пад печчу (каб вяла гаспадарку) [3; 5–6; 10]. Гэтаму ж садзейнічалі і розныя малітвы, што чыталіся над дзецьмі. Над дзяўчынкай тры разы паўтаралі "Песню Найсвяцейшай Багародзіцы", над хлопчыкам – "Гасподнюю малітву".

Сацыяльныя адрозненні паміж дзецьмі рознага полу далей замацоўвалі падчас першага купання. Для хлопчыка ў ваду клалі збожжа (маючы на мэце працяг роду), заручальны пярсцёнак бацькі (як магічны круг абароны чалавека, чыё дарослае жыццё будзе праходзіць па-за ахавальнай прасторы дома), лілі піва (каб быў моцным і адважным), маглі пакласці і кнігу (каб быў разумным і адукаваным). Для дзяўчынкі дадавалі малако (каб яе твар усё жыццё быў белым і чыстым), манету-капейку (каб звесці да мінімуму працягласць і хваравітасць месячных) пад купель змяшчалі грабеньчык, іголку, лён (каб стала добрай гаспадыняй і рукадзельніцай) [5–6]. Ваду пасля купання вылівалі пад моцнае, стройнае дрэва (дуб, ясень) – для хлопчыкаў, пад прыгожае пладовае дрэва (яблыня, вішня), пад ганак (каб хутчэй замуж выйшла) – для дзяўчынак. Менавіта ў ходзе першага рытуальнага купання бацька звычайна ўпершыню агучваў імя нованароджанага. Такім чынам, першыя жыццёвыя абрады вызначаюць мужчынскую і жаночую прасторы, якія існуюць ва ўяўленнях беларусаў і спрыяюць сацыяльнаму палавому развіццю. Агульным правілам пры нараджэнні дзяцей было захаванне стабільнасці, жыццёвай сталасці, духоўна-энергетычнай раўнавагі. Гэтым імкнуліся "абараніць" долю, лёс дзіцяці, каб той, вырастаючы, "не цураўся роднай хаты", гэта значыць выконваўся шэраг забарон: аддаваць, выносіць, прадаваць, з'язджаць, пазычаць і г.д. [5].

Прызнанне дзіцяці як прыналежнага да мужчынскага або жаночага свету ад нараджэння да 6–8-гадовага ўзросту носіць, у асноўным, аднолькавы абрадавы і сацыяльны характар. Дзеці маюць аднолькавую вопратку (доўгая кашуля), спяць і гуляюць разам, знаходзяцца пад наглядам старэйшых братоў і сёстраў і маці. Адзначаецца неабходнасць асаблівага падыходу да дзяцей дадзенага ўзросту: "Да пяці год пястуй дзіця, як яечка, з сямі – пасі, як авечку, тады выйдзі на чалавека" [1; 8].

Да 5-гадовага ўзросту дзеці пачынаюць паступова ўключацца ў працоўную дзейнасць, што арыентавана на фарміраванне гендарнай ідэнтыфікацыі як базавай структуры сацыяльнай ідэнтычнасці, якая характарызуе чалавека з пункту гледжання прыналежнасці да мужчынскай або жаночай групы [7, с. 31–32]. Прыкладна з 6–8 гадоў пачынаецца адасабленне ў гульнях і працы хлопчыкаў ад дзяўчынак. Існаваў абрад пераходу ў наступны ўзроставы этап, звязаны з пераапрананнем дзяцей у прысутнасці ўсёй сям'і: хлопчык, што надзеў штаны, сядаў на каня, а дзяўчынка ў спадніцы, якая была перашыта з матчынай, на лаву каля калаўрота.

З 12–14 гадоў хлопчыкі пераходзяць пад апеку да бацькі, яны разам косяць, зграбаюць сена, нарыхтоўваюць дровы і г.д. Дзяўчынкі застаюцца пад апекай маці. Калі да гэтага ўзросту не было строгага размежавання па месцы знаходжання дзяцей рознага полу, то зараз пачынаецца аддзяленне хлопчыкаў-падлеткаў ад дзяўчынак: хлопчыкі гуляюць і спяць з хлопчыкамі, засвойваюць мужчынскія віды працы. Канец падлеткавага перыяду вызначаецца даволі актыўным удзелам хлопчыкаў у гаспадарцы сям'і, яны атрымліваюць права на ўдзел у сходах моладзі. Дзяўчыны пачынаюць назапашваць пасаг, у вопратку ўключаюць элементы дарослага адзення, пачынаюць далучацца да ігрышчаў, вечарынак, гуляюць вядучую ролю ў шэрагу абрадаў. Напрыклад, абрад "Завіванне бярозкі" (у чацвер на траецкім тыдні дзяўчыны сплятали вянкі з бярозавых галін, варожачы пры гэтым на лёс блізкіх і каханых) [5].

Гендарная дыферэнцыяцыя ў беларускай сям'і знаходзіць адлюстраванне ў прыказках і прымаўках. Напрыклад, "Ад дурнога куста і дубец крывы, і ягада пуста", "Лысая карова лысае цяля прывядзе", "Па роду і куры чубатыя", "Якія бацькі, такія і дзеці", "Якое карэнне, такое і насенне", "Яблычак ад яблыні далёка не адкочваецца", "Бацька – рыбак, і дзеці ў ваду глядзяць", "Якая хатка, такі і тын, які бацька, такі і сын", "Які млын, такі і ставок, які бацька, такі і сынок", "Якое вогнішча, такі і дым, які бацька, такі і сын", "Якое дрэва, такі і клін, які бацька, такі і сын", "Якая матка, такое й дзіцятка", "Якое дрэва, такая і стружка, якая маці, такая і дачушка", "Ад злой маткі злыя дзеткі" [8].

Увага акцэнтуецца і на тое, што кожная сям'я мае свае асаблівыя шляхі развіцця, у выніку чаго магчыма нараджэнне самых розных нашчадкаў, прычым не заўжды з прыемнымі характарыстыкамі. Як кажуць: "Няма роду без выроду", "У балоце не без чорта, а ў роду не без выроду", "У кожнай чарадзе авечку з матылiцамі знойдзеш", "І на здаровай яблыні гнілы яблык знойдзецца", "І ў добрай сям'і вырадак бывае", "Няма лесу без воўка, а сяла без злодзея" [8–9].

Для беларусаў вельмі важным момантам з'яўлялася ўступленне чалавека ў шлюб, стварэнне сям'і. А.К. Сержпутоўскі прыводзіць наступны расповед палешука: "Радзіны, вяселле і смерць – гэта самае важнае ў жыццю чалавека. Радзіны кожны перажыў, а смерці не міне, а вяселле – як Бог судзіць. Калі нежанаты памрэ, та на том свеце будзе пасціць коз, а дзеўка казлоў, калі яны на гэтум свеце не пазнаюць жыцця..." [цыт. па: 3, с. 197–198]. Менавіта да пераходу ў стан шлюбных рыхтуе народ сваіх дзяцей: "Няма горшай кары, як жыць без пары", "Кожная пачвара мае сваю пару", "Хто любіць, то і прыгалубіць", "Не піў, не еў бы, а на жонку глядзеў бы", "У добрай гаспадыні і певень нясецца", "Не кайся рана ўстаўшы, а змоладу жаніўшыся", "Замуж выйсці – трэба знаць: позна легчы, а рана ўстаць", "Як жэняцца, скачуць, а як разводзяцца, дык плачуць", "Мужык з жонкай сварацца, а ў печы трасца варыцца", "З вялікіх пераборaў засталіся толькі лапці і аборы", "Ня бойся п'яніцы, а бойся нідбаліцы, бо п'яны прасьпіцца, а гультай гэткім будзе да веку" [4; 9]. З гэтай мэтай ухваляецца жанчына, якая валодае навыкамі вядзення гаспадаркі, добрым характарам: "Добрая жонка – дома рай, благая – хоць ты цягу дай", "Хто жонку добру мае, той гора не знае", "Там і Бог раюе, дзе жонка мужыка шануе". Адзначаюцца патрабаванні прывабнасці дзяўчыны і жанчыны ("Дзявоцкая краса – заплеценая каса і руцьвяны вяночак", "Дзеўка без касы не мае красы", "Ні радзіся краснай, а радзіся шчаснай", "Нашу дачку пазнаюць і ў андарачку", "Добрая жонка дом зберажэ, а ліхая рукавом растрасе"), хлопца і мужчыны ("Не той харош, хто прыгож, а той харош, хто для дзела гож", "Ні радзіся хвасьліў, а радзіся шчасьліў", "Няхай мужык як шкарпэтка, абы жонка як кветка", "Хоць мужык як лапаць, абы за ім не плакаць", "Мужык хай будзе як долата, абы ты за ім была як золата", "Сякі-такі мужчына, абы дровы ды лучына", "Мужык як варона, ды ўсё жонцы абарона") [4; 8–9]. Бачна, што фізічная прывабнасць - пажаданая, але не вырашальная ўмова выбару

шлюбнага партнёра. Галоўная рыса – прыстасаванасць да сямейнага жыцця, да вядзення гаспадаркі, добры нораў. Магчыма, гэта адна з прычын моцных сямейных адносін.

Абавязковым этапам жыццёвага цыкла было абранне шлюбу. Прычым асаблівае патрабаванне да дзяўчыны – быць замужам. Напрыклад: "Хоць за быка, як няма маладзіка", "Хоць за казла, абы замуж пайшла", "Хоць за вала, абы дома не была", "Хоць за старца, абы не астацца", "Хадзі за казла, абы з дому спаўзла", "Выйсці хоць і за лапаць, абы не плакаць", "Хоць лядашчы мужычок, ды затулле мае: завалюся за яго, не баюся нікаго", "Які ні пенцялей, але сэрцу весялей", "Хоць які целяпей, але ўдваіх ляпей", "Сякі-такі, абы быў, абы хлеба зарабіў", "Няхай без хлеба пасяджу, але ж на мужа пагляджу". Тлумачыць падобную ўстаноўку магчыма тым, што жанчыне значна цяжэй у адзіноце весці гаспадарку, гадаваць дзяцей, мець сацыяльна станоўчы статус. Таму і існавала грамадская думка аб неабходнасці шлюбных адносін, каб нараджаліся жаданыя дзеці, працягвалася жыццё.

**Заключэнне.** Вывучэнне фальклорных матэрыялаў беларускага народа, абрадаў, звычаяў, традыцый у кантэксце гендарных даследаванняў дазваляе зрабіць наступныя вывады:

- сям'я, нягледзячы на ўсялякія трансфармацыі грамадства, выконвае першасную ролю з усіх сацыяльных інстытутаў у фарміраванні гендарнай культуры як састаўной часткі агульнай культуры, таму сама павінна ёю валодаць на досыць высокім узроўні;
- этнапедагагічныя традыцыі беларускага народа накіраваны на выхаванне годных прадаўжальнікаў роду: як у сацыяльна-культурным сэнсе (носьбітаў ведаў, абрадаў, традыцый народа), так і ва ўтылітарна-практычным (уменне быць носьбітам сацыяльных роляў жанчына–маці–гаспадыня і мужчына–муж–гаспадар, настолькі эфектыўных, каб паўнавартасна весці хатнюю гаспадарку, выхоўваць дзяцей, быць паважаным членам суполкі). У іх можна вылучыць дыферэнцыяцыю накіраванасці выхаваўчых намаганняў маці і бацькі; мэтаў сацыялізацыі дзяцей рознага полу; адрозненні ў сістэме працоўнага навучання і сацыяльнага выхавання хлопчыкаў і дзяўчынак;
- роля бацькоў у фарміраванні гендарнай культуры дзяцей была і будзе не толькі вядучай, але і вызначальнай. Зыходзячы з асноўнага ўплыву на выхаванне бацькі або маці, дзеці становяцца падобнымі на сваіх родных характарамі, схільнасцямі.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. - Мінск: Народная асвета, 1993. - 120 с.
2. Философский энциклопедический словарь / ред.-сост.: Е.Ф. Губский, Г.В. Кораблева, В.А. Лутченко. – М.: ИНФРА-М, 1997. – 576 с.
3. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі; прадм. У.К. Касько. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. 301 с.
4. Дулеба, Г. Прыказкі і прымаўкі Жыткаўшчыны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.palese.by/2009/11/Prykazki-i-prymauki-ZHytkaushchyny /. – Дата доступу: 23.01.2014.
5. Котович, О. Золотые правила народной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2010. – 592 с.
6. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск: Ураджай, 2001. 350 с.
7. Словарь гендерных терминов / под ред. А.А. Денисовой. – М.: Информация – XXI век, 2002. – 256 с.
8. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. / рэд. А.С. Фядосік. Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 560 с.
9. Санько, З. Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем / З. Санько. Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 218 с.
10. Ракава, Л.В. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX–XX стст. / Л.В. Ракава. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 311 с.


## *REFERENCES*


1. Arlova G.P. Belaruskaya narodnaya pedagogika [Belarusian Folk Education], Minsk: Narodnaya asveta, 1993, 120 p.
2. Gubskii E.F., Korableva G.V., Lutchenko V.A. Filosofski entsiklopedicheski slovar [Philosophical Encyclodedia Dictionary], M.: INFRA-M, 1997, 576 p.
3. Srezhputouski A.K. Pripkhi i zababoni belarusau-paleshukou [Jokes and anekdotes by Belarusians Pelesye Dwellers], Minsk: Universitetskaye, 1998, 301 p.
4. Duleba G. Prikazki i primauki Zhidkaushchini [Proverbs and Sayings of Zhidkovichi District], http://www.palesc.by/2009/11/Prykazki-i-prymauki-ZHytkaushchyny /. Access date: 23.01.2014
5. Kotovich O., Kruk Ya. Zolotiye pravila narodnoi kulturi [Golden Rules of Folk Culture], Mn.: Adukatsiya i vyhavanne, 2010, 592 p.
6. Kruk Ya. Simvolika belaruskai narodnai kulturi [Symbolics of Belarusian Folk Culture], Minsk: Uradzhai, 2001, 350 p.
7. Dernisova A.A. Slovar gendernikh terminov [Dictionary of Gender Terms], Moscow: Informatsiya – XXI vek, 2002, 256 p.
8. Fyadosik A.S. Prikazki i primauki u dzvyuh knigah [Proverbs and Sayings in Two Books], Mn.: Navuka i tehnika, 1976, 560 p.
9. Snako Z. Mali riska-balaruski slounik prikazak, primavak i frazem [Small Russian-Belarusian Dictionary of Proverbs and Sayings], Mensk, Navuka i tehnika, 1991, 218 p.
10. Rakava L.V. Evalyutsiya traditsii siameynaga vihavannia belarusau u XIX-XX st . [Evolution of the Traditions of Belarusians' Family Upbringing in the XIX-XX Centuries], Minsk: Belaruskaya navuka, 2009, 311 p.


*Поступила в редакцию 06.03.2014. Принята в печать 21.04.2014*
***Адрес для корреспонденции:*** e-mail: soc-work@rambler.ru – Мацюшкова С.Д.